ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
12
ЧЭРВЕНЯ
N21
№ 20 (1506)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

## ГОСЦЕМ

універсітэта быў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Г. А. Ягадзін. Ён пазнаёміўся з тым, як абмяркоўваецца ў калектыве праект ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».

А. ВІХРОВА.

## АДБЫЎСЯ ЗЛЁТ

удзельнікаў Усесаюзнага паходу па месцах баявой славы савецкага народа Маскоўскага раёна Мінска. Каманда універсітэта заняла III месца. Мы былі першымі ў ваенізаванай эстафеце, на этапе пераадолення турысцкай паласы перашкод. Лагер нашай каманды быў прызнаны лепшым, а каманда заваявала права называцца самай арганізаванай. З адказнасцю абаранялі гонар каманды Ю. Бацян, Ю. Жук, Г. Малый, А. Бурдыка, Н. Жаркова, С. Кулік.

А. МАЛЯРЭВІЧ.

## У ФОНД

пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС кафедра рускай мовы філалагічнага факультэта (загадчык кафедры прафесар П. П. Шуба) пералічыла сваю прэмію ў памеры 240 рублёў, якую атрымала за III месца па выніках сацспаборніцтва. Члены кафедры сабралі таксама вопратку і абутак для дзяцей і іх бацькоў, якіх прыняў прафілакторый універсітэта.

Т. МІХАЛЬЧУК,
аспірантка кафедры рускай мовы.

## ЗАПРАШАЕ

гарадское камсамольска-маладзёжнае кафэ «Алімпійскае» на тэматычныя вечары адпачынку. Дыскатэка кафэ — пераможца III гарадскога конкурсу. Працуе безалкагольны бар.

Білеты прадаюцца ў кафэ з 18.00 да 19.30 штодзённа, акрамя панядзелка. Прымаюцца калектыўныя заяўкі.

І. ДАБРАВОЛЬСКІ,
мастацкі кіраўнік.

## ІНІЦЫЯТЫВУ

студэнцкага атрада «Рытм» юрыдычнага факультэта — адпрацаваць дадатковы дзень у фонд пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС — падтрымалі многія атрады універсітэта. Такія ж рашэнні прынялі на агульных сходах «Рубін», «Белая Русь», «Алеся», атрад імя М. Осіпавай (юрыдычны факультэт), «Прамень», «Стэлуца» (мехмат), «Фестывальны» (філфак), атрад імя Сандзіна (фізфак).

У штаб працоўных спраў працягваюць паступаць рашэнні сходаў СБА.

С. АФАНАСЬЕВА.

## ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА: АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ПЕРАБУДОВЫ




ЯКОЙ БЫЦЬ заўтрашняй адукацыі? Гэта цікавіць і хвалюе сённяшніх студэнтаў. Бо ад перабудовы, не будзе перабольшаннем сказаць, залежыць інтэлектуальны патэнцыял нашай краіны.

НА ЗДЫМКУ: з праектам ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» знаёмяцца студэнты механіка-матэматычнага факультэта — члены камітэта камсамола факультэта Вольга Зотава, Алена Сушкевіч, камсорг групы Аляксандр Дзікевіч.

## ВЫКЛАДЧЫК — ГАЛОЎНАЯ ФІГУРА

**Якасць навучальна-выхаваўчага працэсу вызначаецца перш за ўсё саставам прафесараў і выкладчыкаў.**

(З праекта ЦК КПСС).

АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА, якая стаіць перад кафедрай навуковага камунізму БДУ імя У. І. Леніна,— гэта камуністычнае выхаванне студэнтаў як у працэсе выкладання навуковага камунізму, так і ў пазавучэбны час. Адзін з галоўных фактараў дасягнення гэтай мэты — адзінства навучання і выхавання.

З дапамогай выкладчыкаў кафедры ва універсітэце ажыццяўляецца планаванне ідэйна-выхаваўчай работы. Распрацавана «Комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на ўвесь перыяд навучання», у якой адлюстраваны ўсе формы выхаваўчага працэсу — ідэйна-палітычная, маральна-эстэтычная, працоўная і фізічная.

На кафедры расшыраецца практыка чытання праблемных лекцый, укараняюцца актуальныя формы правядзення семінарскіх заняткаў. Мэта іх — развіваць у студэнтаў уменне самастойнага аналізу і ацэнкі грамадскіх з'яў з пазіцый марксізму-ленінізму, фарміраваць навыкі прапагандысцкай і арганізатарскай работы. Іменна гэтага і патрабуе праект ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне». Таму пераглядаем змест лекцыйнага курса, планаў семінарскіх заняткаў, тэматыку дыпломных і курсавых работ, а таксама рэфератаў і дакладаў студэнтаў, якія прадстаўляюцца на ўсесаюзныя конкурсы па грамадскіх навуках.

Мы пераканаліся, што важную ролю ў камуністычным выхаванні адыгрывае грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Пры арганізацыі яе імкнёмся ўвязаць змест практыкі з надзённымі эканамічнымі задачамі працоўных калектываў прадпрыемстваў і арганізацый. Думаецца, наспела неабходнасць падрыхтаваць навучальныя дапаможнікі па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў, у якіх быў бы ўсебакова абагульнены вопыт правядзення гэтай важнай работы.

Разам з поспехамі ёсць у выкладанні грамадскіх дысцыплін і недахопы. Не сакрэт, што асобныя заняткі праходзяць сумна, на іх ставяцца абстрактныя, адарваныя ад жыцця праблемы. Здараецца і такое, калі добра пасляваючы па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах студэнт праяўляе апалітычнасць або палітычную неадукаванасць. Гэта сведчыць аб тым, што веды не заўсёды ўплываюць на свядомасць, існуе разрыў паміж словам і справай.

Выхаванне студэнцтва, фарміраванне ў яго навуковага светапогляду і высокіх грамадзянскіх якасцей — абавязак не толькі грамадазнаўцаў, а і ўсіх прафесараў і выкладчыкаў, незалежна ад іх навуковага профілю і спецыяльнасці. На жаль, ёсць яшчэ выкладчыкі, якія лічаць, што іх уплыў на студэнцкую моладзь абмяжоўваецца часам, адведзеным на чытанне спецыяльных дысцыплін, некаторыя з іх не цікавяцца патрэбамі, поглядамі студэнтаў, пазбягаюць сустрэч з моладдзю па-за аўдыторыяй.

Недахопы ў рабоце па камуністычнаму выхаванню прыводзяць да таго, што ў некаторых студэнтаў, аспірантаў, а іншы раз і выкладчыкаў праяўляюцца негатыўныя рысы — нядобрасумленныя адносіны да вучобы, навуковай работы, парушэнне норм сацыялістычнай маралі, працоўнай дысцыпліны. Іменна на вырашэнне ўсіх гэтых праблем і скіраваны меры па перабудове вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне.

П. ДРОНЬ,
загадчык кафедры навуковага камунізму.

**У ВЫНІКУ ПЕРАБУДОВЫ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ШКОЛЫ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСПЕЧАНА НОВАЯ ЯКАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ З КАРЭННЫМ ПАЛЯПШЭННЕМ ІХ ВЫКАРЫСТАННЯ, ЯКАЯ ГАРАНТУЕ ВЫХАД НАШАЙ КРАІНЫ НА ПЕРАДАВЫЯ РУБЯЖЫ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА І САЦЫЯЛЬНАГА ПРАГРЭСУ.**

(З праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне).

## НАСТРОЙ НА ВЫНІКОВАСЦЬ

**Для інжынернай адпрацоўкі вынікаў даследаванняў і паскарэння іх укаранення ў практыку патрабуецца фарсіраваць развіццё ў вышэйшай школе канструктарска-тэхналагічнай і доследна-эксперыментальнай базы і, у першую чаргу, міжвузаўскіх арганізацый і прадпрыемстваў.**

(З праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне»).

ВЫКЛАДЧЫКІ, супрацоўнікі, студэнты і аспіранты фізічнага факультэта з глыбокім задавальненнем і зацікаўленасцю ўспрынялі праект ЦК КПСС аб перабудове вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне. У падраздзяленнях факультэта ідзе актыўнае, творчае вывучэнне і абмеркаванне праекта, аналізуюцца шляхі і сродкі паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў, удасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі ў цэлым. Прапановы, якія выказваюцца ў ходзе абмеркавання, дапамогуць вызначыць канкрэтныя шляхі рашэння задач, пастаўленых партыяй перад работнікамі вышэйшай школы.

Прадметам асаблівай увагі калектыву фізічнага факультэта з'яўляюцца палажэнні праекта, якія прадугледжваюць усямернае развіццё навукі ў ВНУ. Поспехі вучоных нашага факультэта значныя. У XI пяцігодцы супрацоўнікі факультэта ўдастоены прэміі Савета Міністраў СССР. дзвюх прэмій Ленінскага камсамола Беларусі, залатога медаля ВДНГ СССР. Выкананы фундаментальныя даследаванні ў галіне оптыкі і спектраскапіі, тэарэтычнай фізікі, матэрыялазнаўства. Распрацаваны шэраг прылад і прыстасаванняў, якія выпрабляюцца серыйна або ўкаранёны ў вытворчасць. Аднак больш поўнае выкарыстанне наяўнага патэнцыялу, хутчэйшае укараненне выкананых распрацовак і павышэнне іх узроўню настойліва патрабуе ажыццяўлення цэлага шэрагу мер. Неабходна рэзка павысіць узровень аснашчэння факультэта сродкамі вылічальнай і мікрапрацэсарнай тэхнікі, іншым сучасным абсталяваннем. Ёсць настойлівая неабходнасць стварэння на факультэце шэрагу цэнтраў калектыўнага карыстання, міжкафедральных лабараторый. Значна стрымлівае развіццё даследаванняў і недастатковая вопытна-вытворчая база. Патрабуе ўдасканалення практыка заключэння і выканання гаспадарча-дагаворных работ. Праект прадугледжвае меры, якія дазволяць рашыць побач з іншымі і гэтыя задачы.

Наперадзе вялікая работа. Калектыў фізічнага факультэта, яго партыйная арганізацыя прыкладуць усе намаганні для хутчэйшага выканання планаў партыі, ажыццяўлення рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

В. ГАЙСЁНАК,
дэкан фізічнага факультэта.

